УДК 94(476)+929

***С.П. Марозаў***
*канд. гіст. навук, старшы выкладчык каф. журналістыкі*
*Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы*
e-mail: banifacyj@mail.ru

# «ЛІТОЎСКІ СЕПАРАТЫСТ» КАНСТАНЦІН КАЛІНОЎСКІ

*Пытанне аб дзяржаўнасці беларуска-літоўскіх зямель набыло ў 1861–1864 гг. новае грамадскае гучанне: з кім ім быць – з Расіяй, Польшчай або «ні з кім». Лозунг барацьбы за дзяржаўную самастойнасць Літвы і Беларусі на аснове гістарычнай традыцыі Вялікага Княства Літоўскага і патрабаванне свабоднага нацыянальнага-культурнага развіцця яго народаў, сфармуляваныя К. Каліноўскім у час паўстання 1863 г., далі падставу шмат каму з сучаснікаў трактаваць яго палітычную пазіцыю як сепаратысцкую. У сепаратызме адносна Польшчы яго абвінавачвалі дзеячы Варшаўскага Цэнтральнага Нацыянальнага Камітэта Я. Гейштар, О. Авейдэ, Ю. Яноўскі. Пра федэралісцкія і сепаратысцкія тэндэнцыі К. Каліноўскага пісалі першыя даследчыкі паўстання і яго ўдзельнікі В. Пшыбароўскі і Б. Ліманоўскі. Яго сепаратысцкае крэда настойліва падкрэсліваў афіцыйны гістарыёграф паўстання В.Ф. Ратч. Публіцыстычная спадчына самога К. Каліноўскага сведчыць, што ён выступаў абаронцам інтарэсаў гістарычнай Літвы і яе народаў. Наяўнасць у яго прагараме патрабавання незалежнай літоўска-беларускай дзяржавы прызнаюць даследчыкі паўстання У. Ігнатоўскі, А.П. Смірноў, Г. Кісялёў і інш.*

## Уводзіны

Абуджэнне ў Беларусі навуковай і грамадскай цікавасці да паўстання 1863 г. і постаці К. Каліноўскага – з’ява нашага часу [1–8]. Навуковыя мерапрыемствы і публікацыі з нагоды 150-годдзя паўстання засведчылі, што пытанне аб дзяржаўна-палітычных поглядах яго кіраўніка ў Беларусі і Літве па-ранейшаму хвалюе вучоных і выклікае дыскусіі. Разам з тым стала відавочнай нераспрацаванасць праблемы паўстання ў Беларусі ў айчыннай гістарыяграфіі [5, с. 115]. Грунтоўнай працы, якая асвятляла б палітычныя ідэалы К. Каліноўскага з улікам сучаснага стану ведаў, крыніцавай базы і метадалогіі, пакуль няма.

Мэта артыкула – абгрунтаваць наяўнасць у праграме К. Каліноўскага лозунга барацьбы за дзяржаўную самастойнасць Літвы і Беларусі на аснове гістарычнай традыцыі ВКЛ. Задача працы – на фоне новага грамадскага гучання, якое набыло ў 1861–1864 гг. пытанне аб дзяржаўнасці беларуска-літоўскіх зямель, паказаць трактоўку палітычнай пазіцыі К. Каліноўскага як сепаратысцкай людзьмі, што былі да яго блізкімі і ведалі яго асабіста, хоць і прадстаўлялі ўрадавы лагер, і даследчыкамі.

Пры рэалізацыі пастаўленай мэты аўтар абапіраўся на працы класікаў гістарыяграфіі паўстання, якія звярталіся да постаці К. Каліноўскага і пытання аб яго ідэалогіі: дарэвалюцыйнай (В. Ратч [9]), савецкай (У. Ігнатоўскі [10], А. П. Смірноў [11–13], В. Шалькевіч [14]), замежнай (А.І. Ляскоўскі [15], Д. Файнгауз [16], С. Ланец [17; 18]), сучаснай беларускай (М. Біч [19], Г. Кісялёў [20]). Навуковай узважанасцю характарызуюцца трактоўкі цяперашняга пакалення спецыялістаў па паўстанні (А.Р. Радзюк [1, с. 208–223; 2, с. 133–173; 4, с. 27–34], Д.Ч. Матвейчык [5; 6], А. М. Філатава [2, с. 8–14; 5; 21, с. 196–226; 22, с. 103–135], А.Э. Фірыновіч [1, с. 384–396]).

Апублікаваныя і архіўныя крыніцы, пакладзеныя ў аснову дадзенага артыкула, прадстаўлены публіцыстычнай спадчынай самога К. Каліноўскага [20; 23], судова-следчымі матэрыяламі па справах паўстанцаў, паказаннямі паплечнікаў [20, с. 129–146; 24–27; 28, с. 245–250], паўстанцкай публіцыстыкай, апублікаванай у падпольнай прэсе («Gazeta Polska», «Chorągew swobody»; «Głos z Litwy», «Niepodległość» і інш. [20, с. 49–76; 29, с. 140–146; 30]), успамінамі і першымі гістарычнымі нарысамі аб паўстанні людзей, блізкіх да асобы яго кіраўніка (О. Авейдэ [20, с. 174–178; 31], Я. Гейштара [20, с. 154–158,

186–187, 205–206], Е. Курчэўскага-Порай [20, с. 171–174]) і іншымі сучаснымі паўстанню і аўтэнтычнымі матэрыяламі («Сведения» В. Ратча [9; 20, с. 150–154], «Гісторыя» Пшыбароўскага [20, с. 163–166]).

**Пытанне аб дзяржаўнасці беларуска-літоўскіх зямель у 1861–1864 гг.**

Падзеі 1861–1864 гг. на абшарах былой Рэчы Паспалітай актуалізавалі пытанне аб дзяржаўнасці беларуска-літоўскіх зямель. Карэспандэнцыя з Вільні, апублікаваная 10 лістапада 1863 г. у варшаўскай газеце «Niepodległość», сфармулявала наступнае палажэнне: «Дзяржавы, якія не маюць традыцыі, гістарычных правоў і мінулага, абавязаны сваім часовым існаваннем збегу палітычных абставін… з'яўляюцца і знікаюць, не пакідаючы ніякіх слядоў у гістарычным развіцці чалавецтва. Але народ, які нясе на сваіх плячах цяжар дзесяцівяковай мінуўшчыны, хоць часова раскрыжаваны гістарычнымі нягодамі, тым не менш не перастае жыць і мае права на існаванне, чарпанае са сваёй традыцыі і месца ў гістарычнай цывілізацыі» [30, л. 40]. Чалавекам, які «першы ўзняў крышку дамавіны, у якую Літва 70 гадоў таму была пакладзена», хоць і заплаціў за гэта сваім жыццём, газета назвала кіраўніка паўстанцкага атрада Людвіка Нарбута [30, л. 40адв.]. Аўтар карэспандэнцыі лічыў патрэбным «даказаць Еўропе, што яе бяспека і гарантыя спакойнага развіцця цывілізацыі ляжыць над Віслай і Нёманам» [30, л. 40].

У адрозненне ад папярэдняга паўстання, у якім, на думку А.М. Філатавай, дамінавалі настроі на далучэнне беларуска-літоўскіх зямель да Польшчы [2, с. 14], пытанне аб іх дзяржаўнасці набыло ў 1861–1864 гг. новае грамадскае гучанне. «Быць Літве, Беларусі і Украіне з кім яны хочуць або ні з кім, абы толькі волю іх ведаць – не падробную, а сапраўдную», – выступіў восенню 1862 г. у абарону права краінам самім вырашаць свой лёс вядомы рускі дэмакрат А.І. Герцэн [32, с. 446]. Пытанне, з кім ім быць: з Расіяй або Польшчай або застацца па-за іх межамі («ні з кім») – востра паўстала тады ў грамадска-палітычнай думцы, абмяркоўвалася на старонках друку.

Частка беларуска-літоўскага дваранства ў пачатку 1860-х гг. прадпрымала крокі, каб перахапіць уладу ў краі ў свае рукі і фактычна ўзнавіць аўтаномію ВКЛ мірным шляхам. Прадвадзіцель дваранства Гродзенскай губерні граф В. Старжынскі, як канстатаваў у сваіх успамінах віленскі генерал-губернатар М. Мураўёў, «падаваў… праекты ўваскрашэння Літвы, аддзеленай ад Расіі», міністру ўнутраных спраў П. Валуеву, ваеннаму міністру Д. Мілюціну, міністру замежных спраў А. Гарчакову [7 с. 65; 21, с. 221], неаднаразова «чытаў... свае праекты» самому імператару. Арыштаваны па загадзе М. Мураўёва, граф даваў паказанні, што «аб палітычным сэнсе адарвання Літвы ад Імперыі і не думаў» [25, л. 13], як і не падзяляў «жадання адміністрацыйнага далучэння Літвы да Царства Польскага» [25, л. 9адв.]. У лісце з Рэчыцы ад 17 лютага 1862 г., знойдзеным пры вобыску ў аднаго з лідараў беларускага дваранства ліберала А. Аскеркі, адрасат пытаўся: «Што ж там у Вас адбываецца, мой Аляксандр, нейкія партыі ўтварыліся, якія хочуць мець асобную Літву» [26, л. 62].

Як адзначаў у запісцы для следства адзін з кіраўнікоў паўстання 1863 г. О. Авейдэ, «самыя найгалоўныя правінцыі Польшчы, якія даюць ёй уласна дзяржаўнае значэнне і вагу, – Літва з Беларуссю і Маларосія – або прама і адкрыта заявілі аб сваім нежаданні складаць неадлучную частку Польшчы (як Маларосія), або былі рашуча абыякавыя да імкненняў польска-самастойных» [31, с. 97].

У гэтым кантэксце зусім лагічнай з'яўляецца пазіцыя, якую займаў К. Каліноўскі ў пытанні ўзаемаадносін з Польшчай і будучага лёсу гістарычнай Літвы (Беларусі і Літвы, былога ВКЛ), адлюстраваная ў сведчаннях яго сучаснікаў.

**Федэралісцкая і сепаратысцкая пазіцыі К. Каліноўскага вачамі блізкіх да яго людзей – удзельнікаў, кіраўнікоў і першых даследчыкаў паўстання**

Адзін з найбольш аўтарытэтных кіраўнікоў партыі «белых» у Літве і Беларусі Я. Гейштар, які добра ведаў К. Каліноўскага асабіста і, хоць быў яго ідэйным праціўнікам, працаваў разам з ім, у мемуарах характарызаваў Каліноўскага як чалавека, які «адданы быў душой і сэрцам народу і айчыне» і падумваў аб самастойнасці Літвы [23, с. 166]. Я. Гейштар асуджаў К. Каліноўскага за сепаратызм, бо распачатая тым «палеміка ў час барацьбы пра межы Літвы і Польшчы» падрывала адзінства сіл у паўстанні [20, с. 154, 156]. Крайнасць сацыяльнай праграмы і сепаратысцкія тэндэнцыі адносна Польшчы – гэтыя дзве рысы адзначаў Я. Гейштар у К. Каліноўскага, і яны абедзве яму не падабаліся.

Па ўспамінах сакратара Цэнтральнага Нацыянальнага Камітэта (ЦНК) Ю. Яноўскага, К. Каліноўскі «сувязь Літвы з Польшчай разумеў толькі як федэратыўную – з поўнай незалежнасцю Літвы» [20, с. 161]. В. Пшыбароўскі, які займаў адказныя пасады ў паўстанцкіх структурах Варшавы (у тым ліку сакратара Літвы), у сваёй «Гісторыі двух гадоў» пісаў, што К. Каліноўскі ўзяў у Герцэна яго палітычную праграму, грунтаваную на ідэі, што «славянскія землі… павінны ўтварыць федэрацыю незалежных дзяржаў», і «ва ўсёй яе паўнаце стасаваў да Літвы» [20, с. 165]. Кіраўнік паўстання, па словах В. Пшыбароўскага, лічыў, што «Літва павінна разам з Польшчай дабівацца незалежнасці, змагацца за пазбаўленне ад чужога захопніка, але складаць асобную адзінку, зусім незалежную ад Польшчы і звязаную з ёй толькі федэратыўнымі сувязямі… У паўстанні бачыў ён найперш незалежнасць Літвы, а пасля сацыяльную рэвалюцыю» [20, с. 165–166]. Прынцып аднаўлення Польшчы тады не супярэчыў імкненню народаў былога ВКЛ да ўласнай дзяржаўнасці.

Прыхільнік адраджэння Рэчы Паспалітай у ранейшых межах з роўнасцю ўсіх яе народаў ураджэнец Віцебскай губерні Б. Ліманоўскі ў сваёй «Гісторыі паўстання» (створана каля 1880 г.) пісаў пра К. Каліноўскага, што той «раўніва пільнаваўся поўнай роўнасці і самастойнасці Літвы», хоць і лічыў унію з Польшчай гістарычнай неабходнасцю [20, с. 161–162]. Гэта, праўда, пярэчыць звесткам В.Ф. Ратча, з якіх вынікае, што К. Каліноўскі даволі скептычна ставіўся да аднаўлення ўніі з Польшчай.

**В.Ф. Ратч пра сепаратысцкае крэда К. Каліноўскага**

У Літоўскім правінцыйным камітэце (ЛПК), як сведчыў афіцыйны гістарыёграф паўстання В.Ф. Ратч, які меў доступ да ўсіх матэрыялаў следства па справах удзельнікаў паўстання, спачатку ніхто не звяртаў увагі на спосаб вырашэння нацыянальна-дзяржаўнага пытання, ды і разумелі яго «цьмяна». З. Серакоўскі, Ф. Далеўскі, Л. Звяждоўскі настойвалі на праекце канфедэратыўнай Рэчы Паспалітай «з нацыянальным прадстаўніцтвам Літвы» [20, с. 152, 153]. К. Каліноўскі разыходзіўся з імі ў поглядах, хоць мэта ва ўсіх была адна – незалежнасць Айчыны. Ён, калі стаў на чале «самых славалюбівых асоб з чырвоных ліцвінаў, настойліва праводзіў ідэю самастойнасці Літвы» [9, с. 184]. К. Каліноўскі, па словах В. Ф. Ратча, «зусім не быў схільны працаваць дзеля Польшчы і… бачыць Літву ўцягнутай у той жа вір» шляхетных традыцый уваскрошанага старажытнага магнацтва, «з нацяжкай прыстасаваных да XIX ст.» [20, с. 152–153]. Ён «асцерагаўся таго зліцця з Польшчай, пры якім потым ад яе нельга было б і адчапіцца» [20, с. 153]; «стаяў уважлівым вартаўніком інтарэсаў Літвы і адстойваў, каб сродкі і сілы Літвы зусім не ішлі на справы Царства Польскага» [19, с. 154]. Сваім калегам па Камітэце К. Каліноўскі гаварыў, што «Літва… павінна скарыстацца разладам паміж Расіяй і Польшчай і зрабіцца самастойнай» [20, с. 154]. Сваімі ідэямі ён «да таго захапіў усіх ліцвінаў», што ўжо ў 1862 г. Л. Звяждоўскі, яго асабліва моцны ідэйны праціўнік, «быў рэўнасным абаронцам самастойнай Літвы» [20 с. 153].

Па меркаванні В.Ф. Ратча, К. Каліноўскі жадаў цалкам пазбавіцца ад варшаўскай апекі, і па вырабе асобнай пячаткі для ЛПК «варшаўскі жонд павінен быў за подпісам,

выражаным штэмпелем новай устаноўленай улады, атрымаць паведамленне, што Літва і Беларусь – самастойная дзяржава» [9, с. 231]. У аснове ўзаемаадносін паміж віленскімі і варшаўскімі канспіратарамі ляжала нежаданне падпарадкаваць паўстанне ў Беларусі і Літве інтарэсам Варшавы, якая ў недастатковай ступені паважала іх суверэнітэт. Таму ў ЛПК быў моцны недавер да ЦНК, які абвінавачвалі ў няведанні ўмоў і патрэб Літвы. Сепаратысцкае крэда К. Каліноўскага выражалася ў пастулаце: «Такой дурной галаве, як Варшава, нельга давяраць будучы лёс Літвы» [9, с. 181]. Стаўшы гаспадаром становішча ў ЛПК пасля ад'езду Л. Звяждоўскага ў Маскву, ён «з нязгаснай энергіяй спрачаўся з «бязглуздымі варшаўскімі галовамі» аб поўнай аўтаноміі Літвы» [23, с. 193–194].

Устрывожаны дзеяннямі гэтага «ліцвіна-сепаратыста», яго «спрэчкай аб нацыянальнасцях» [23, с. 196] аж да намеру разарваць усялякія адносіны з Польшчай, ЦНК, як сведчыць В.Ф. Ратч, камандзіраваў у Вільню аднаго са сваіх найбольш дзейсных і здольных сяброў О. Авейдэ з рэпутацыяй заслужанага рэвалюцыянера, змоўшчыка, а да таго ж універсітэцкага таварыша «новага літоўскага дыктатара». О. Авейдэ «было даручана ўламаць Каліноўскага, угаварыць яго любоўю да польскай Айчыны, аб якой самазванец-дыктатар Літвы і Беларусі рашуча ведаць не хацеў» [9, с. 233]. Авейдэ сведчыў, што «недавер да Варшавы быў вельмі моцным у ліцвінаў» [13, с. 79].

В.Ф. Ратч, між іншым, сцвярджае, што сярод віленскіх гараджан і па Жмудзі доўгі час хадзілі чуткі, што ў Вільні пражывае «круль Літвы», які хоча «адхіліцца ад палякаў» і завесці «сваё ўласнае крулеўства» [33, с. 232]. У літаратуры можна сустрэць вызначэнне К. Каліноўскага як «апошняга караля Літвы» [8, с. 5].

**Абарона інтарэсаў Беларусі і Літвы ў публіцыстыцы К. Каліноўскага**

К. Каліноўскі трактаваў Літву і Беларусь як гістарычную і культурную цэласнасць. Для яго гэта быў адзіны рэгіён і ў палітычным сэнсе, са сваёй эканамічнай і нацыянальнай спецыфікай. Ён, хоць і не адмаўляў выпрацаванага гісторыяй спачування Літвы да Польшчы і ўзмоцненага царскай палітыкай нацыянальнага заняволення, але выказаўся за ўтварэнне самастойнага ўрада для свайго краю – «самарондства». Жаданне самастойнасці гістарычнай Літвы ў федэрацыі з Польшчай разам з разыходжаннем па арганізацыйных пытаннях і спосабах вядзення барацьбы выявілася ў канфлікце Віленскага паўстанцкага цэнтра з варшаўскім ЦНК, у цвёрдасці і рашучасці, з якой ЛПК дамагаўся раўнапраўя ва ўзаемаадносінах з Варшавай.

У Тлумачальнай запісцы следству ад 28 студзеня 1864 г. кіраўнік паўстання адхіляў прад'яўленае яму абвінавачанне ў жаданні разрыву дзяржаўнай сувязі з Расіяй. Ён указваў, што пытанне дзяржаўнага ўладкавання залежыць ад больш важнага пытання – забеспячэння народнага шчасця. У той жа час ён аб'явіў сябе ворагам парадкаў, якія пазбавілі беларускі і літоўскі народы дзяржаўнасці і элементарных умоў для развіцця культуры [13, с. 179]. Ён прадказваў, што «пакуль урад не набудзе спачування ў сапраўды адукаваным класе тутэйшага насельніцтва», умацаванне пазіцый Расіі ў Літве немагчымае [20, с. 145]. У гэтай запісцы ён выступаў абаронцам інтарэсаў гістарычнай Літвы і яе народаў. У «Лісце з-пад шыбеніцы» К. Каліноўскі таксама адстойваў права беларускага і літоўскага народаў на бесперашкоднае нацыянальнае развіццё. Ён асуджаў, што ў школах пры царскай уладзе «ніколі не пачуеш і слова па-польску, па-літоўску, да і па-беларуску, як народ таго хоча» [20, с. 43]. Паказальным у гэтым сэнсе з'яўляецца абнародаванне некаторых паўстанцкіх дакументаў на беларускай мове.

Адзін з кіраўнікоў паўстання ў Літве Антанас Мацкявічус з няволі звярнуўся да ўлад з просьбай перадаць цару наступныя патрабаванні: «Дайце Літве закон, дайце намесніцтва, няхай які з князёў паселіцца ў Вільні, а ў той жа час спытайце – ці жадае быць з Расіяй ці з Польшчай? Прымусам нічога не зробіце. Заўсёды будуць трывожыць, заўсёды будуць паўставаць. Вось мае апошнія жаданні і прапановы» [12, с. 323].

Гэта яшчэ адзін, так сказаць, «ліст з-пад шыбеніцы», які сведчыць, што нешматлікая яшчэ тады дэмакратычная інтэлігенцыя Літвы і Беларусі не разглядала паўстанне як справу «чыста польскую»: «Літва паўстала разам з Польшчай, каб дамагчыся незалежнасці» [12, с. 328]. Паўстанец Э. Даўкшыс заявіў следчай камісіі, што ён прытрымліваецца перакананняў не польскіх, а «літоўска-славянскіх» [28, с. 246].

З боку прыхільнікаў «звароту гістарычных межаў Польшчы» адказам на падобныя настроі ў Беларусі і Літве было выданне брашуры «Голас літоўца», у якой рэзка асуджаліся «ўсякія тэорыі аб самастойнай дзяржаўнасці Літвы і Русі» [11, с. 116].

**Слова гісторыкам паўстання**

У трактоўцы У. Ігнатоўскага, які першы ў беларускай гістарыяграфіі прысвяціў паўстанню манаграфію (1930 г.), «чырвоныя» Беларусі і Літвы прымалі агульнае кіраўніцтва Варшавы і прызнавалі неабходнасць палітычнай сувязі з будучай адроджанай Польшчай, але былі незадаволены тэорыяй і асабліва практыкай варшаўскага ЦНК у нацыянальным пытанні. Яны не аднойчы ўздымалі пытанне аб нейкіх пэўных формах палітычнай незалежасці нацыянальных тэрыторый і, калі Варшава забывала пра свае дэкларацыі, рашуча напаміналі ёй аб сваіх «сепаратыстычных» тэндэнцыях. За гэта былі абвінавачаны палякамі-паўстанцамі ў сепаратызме [10, с. 2–3]. «Робячы паўстаньне разам з Польшчаю проці царскай Расіі, – пісаў гісторык пра К. Каліноўскага, – ён разам з тым быў “сэпаратыстым” і ў адносінах да Польшчы». Гэты «сэпаратызм», на думку У. Ігнатоўскага, магчыма, перавялічаны некаторымі аўтарамі – прыхільнікамі «адзінай і непадзельнай» Польшчы. Дакладна вызначыць яго цяжка, бо ён нідзе выразна не сфармуляваны. «Трэба думаць, што “незалежніцтва” К. Каліноўскага вымагала асаблівага віду аўтаноміі для Беларусі ў фэдэрацыйнай Рэчы Паспалітай Польскай» [10, с. 220–221].

І.Н. Лушчыцкі, аўтар нарысаў па гісторыі грамадска-палітычнай думкі Беларусі другой паловы XIX ст., прызнаваў наяўнасць у праграме «чырвоных» патрабавання незалежнай, нацыянальнай літоўска-беларускай дзяржавы, але лічыў яго рэакцыйным, бо гэта азначала адрыў Літвы і Беларусі ад Расіі [33].

Як пісаў А.П. Смірноў, які ў 1960-я гг. прызнаў і станоўча ацаніў пастаноўку К. Каліноўскім пытання аб утварэнні самастойнай Літоўска-Беларускай рэспублікі [22, с. 126], «гісторыя вызваленчага руху ведае шмат прыкладаў, калі папрокі ў сепаратызме, развале дзяржавы, расколе кідаліся рэвалюцыйным дзеячам, якія стойка і паслядоўна адстойвалі інтарэсы прыгнечаных нацый» [12, с. 126]. З другога боку, на думку гісторыка, прадстаўнікі лагера «белых», ЦНК, разглядаючы беларускія і літоўскія землі як частку Польшчы, абʼявілі К. Каліноўскага, які адстойваў інтарэсы беларускага і літоўскага народаў, сепаратыстам, што падпаў пад уплыў рускіх дэмакратаў і пачарпнуў ад іх ідэі, шкодныя польскай справе [13, с. 6]. Для гарантыі нацыянальных правоў гэтых народаў, паводле А.П. Смірнова, К. Каліноўскі патрабаваў ад ЦНК дакладнага вызначэння статусу Літвы. Незадаволены няпэўнымі абяцанкамі федэрацыі, ён адстойваў яе права самой свабодна вызначыць уласны лёс [13, с. 79].

Айчынныя даследчыкі прызнаюць, што беларускі нацыянальны рух у час паўстання ўзняўся на якасна новы ўзровень, бо ў ім нарадзіўся палітычны кампанент – ідэя дзяржаўнай самастойнасці Літвы і Беларусі, і з гэтага часу беларускія, ліцвінскія патрабаванні адасабляюцца з польскага вызваленчага кантэксту. А. Каўка вылучыў у беларускім вызваленчым руху паводле крытэрыю яго самаўсведамлення, арганізаванасці і якаснай эвалюцыі два этапы: пачаткова-падсвядомы рух «у сабе» пераважна ў межах польскага нацыянальна-вызваленчага працэсу (1794–1863 гг.) і рух «для сябе» са свядомай пастаноўкай уласна беларускіх нацыянальных задач і канчатковай мэты – адраджэння беларускай дзяржаўнасці (1863–1918 гг.). К. Каліноўскага даследчык называе

першым беларускім палітычным дзеячам новага часу, які ставіць, хай спачатку недастаткова выразна і паслядоўна, уласна беларускія («літоўскія») патрабаванні ў агульнапольскім нацыянальным руху, уключна з ідэяй самастойнасці Літвы-Беларусі ў дэмакратычным саюзе з Польшчай і Расіяй [34, с. 5–6].

Акадэмічная «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст.» канстатуе, што «ў час паўстання сярод яго кіраўніцтва дамінавалі ідэі і традыцыі гістарычнай дзяржаўнасці ВКЛ» і што пры вырашэнні тэрытарыяльнага пытання паўстанцы, магчыма, кіраваліся крытэрыем гістарычнай суверэннасці ВКЛ [21, с. 224].

Вядомыя польскія даследчыкі паўстання С. Кеневіч і Д. Файнхаўз, а таксама Р. Радзік, якія адмаўляюць намер К. Каліноўскага разарваць з Царствам Польскім, разам з тым прызнаюць факт дамаганняў ЛПК да самастойнага кіравання паўстаннем на сваёй тэрыторыі і яго намер у выніку поспеху вярнуць Літве палітычную адасобленасць у адносінах да Кароны [4, с. 46].

Як падкрэсліў А. Станкевіч, К. Каліноўскі «ўваскрасіў дзяржаўніцкую федэрацыйную ідэю зямель быўшага ВКЛ», якая «замёрла разам зь вялікім Львом Сапегам» [3, с. 153]. Сфарміраваныя пад моцным уплывам рускіх рэвалюцыйных дэмакратаў ідэі К. Каліноўскага прама або апасродкавана аказалі ўплыў на далейшае развіццё беларускай палітычнай думкі. Яго план стварэння Беларуска-Літоўскай дэмакратычнай дзяржавы – законнай спадчынніцы традыцый ВКЛ – перанялі і развілі мысліцелі і палітыкі першай чвэрці ХХ ст. К. Каліноўскі з аднадумцамі сталі важным звяном у ланцугу палітычна-гістарычнай сувязі былога ВКЛ з пазнейшай беларускай нацыянальна-палітычнай традыцыяй.

**Заключэнне**

Вызваленчы рух 1863 г. у Беларусі і Літве нельга разглядаць як другарадны эпізод барацьбы за «гістарычную» Польшчу. Змаганне за аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. не супярэчыла імкненню беларусаў і літоўцаў да аднаўлення ўласнай дзяржаўнасці на аснове гістарычнай традыцыі ВКЛ. Таму дзеянні К. Каліноўскага пры ўсім яго «літоўскім сепаратызме» не трэба ўспрымаць як спробу разарваць адносіны з Царствам Польскім і ідэяй барацьбы за вяртанне Рэчы Паспалітай.

«Літоўскі сепаратызм» К. Каліноўскага выявіўся ў жаданні і патрабаванні гарантый свабоднага развіцця народаў былога ВКЛ. Наяўнасць у яго праграме лозунга барацьбы за дзяржаўную самастойнасць Літвы і Беларусі пацвярджаецца яго сучаснікамі. Паплечнікі К. Каліноўскага, які не згаджаўся падпарадкаваць паўстанне ў Літве і Беларусі інтарэсам Варшавы, – дзеячы варшаўскага ЦНК (Я. Гейштар, О. Авейдэ, Ю. Яноўскі), для якіх Літва і Беларусь былі толькі часткай гістарычнай Рэчы Паспалітай, кінулі яму абвінавачванне ў сепаратызме адносна Польшчы. Аналагічна прадстаўнікі царскай адміністрацыі абвінавачвалі яго ў жаданні адарваць Літву і Беларусь ад Расіі. Гісторыкі, блізкія па часе і часта да асобы К. Каліноўскага (В.Ф. Ратч, В. Пшыбароўскі, Б. Ліманоўскі і інш.), таксама сцвярджаюць, што ён жадаў бачыць Беларусь і Літву незалежнай дзяржавай, злучанай з Польшчай толькі саюзным дагаворам і палітычнай дружбай. Такім чынам, сучаснікі, якія ведалі К. Каліноўскага і былі да яго блізкія, – людзі процілеглых поглядаў і з розных лагераў – сыходзяцца ў сцвярджэнні, што ён адстойваў незалежнасць гістарычнай Літвы. Характарыстыка яго пазіцыі як «сепаратызм» трывала засталася на старонках іх твораў. У святле прыведзеных фактаў сепаратысцкія памкненні К. Каліноўскага не выглядаюць такімі ўяўнымі і няпэўнымі, якімі іх часам лічаць.

У праграме К. Каліноўскага гістарычная навука прызнае наяўнасць лозунга барацьбы за дзяржаўную самастойнасць Літвы і Беларусі на аснове гістарычнай традыцыі ВКЛ (У.М. Ігнатоўскі, І.Н. Лушчыцкі, А.П. Смірноў, Г. Кісялёў, аўтары прац «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст.», «На шляху станаўлен-

ня беларускай нацыі: гістарыяграфічныя здабыткі і праблемы» і інш.). Сумненні наконт выстаўлення ім патрабавання палітычнай самастойнасці Літвы і Беларусі выказваюцца аўтарамі, якія, як правіла, спецыялістамі па паўстанні 1863 г. і біяграфіі К. Каліноўскага не з'яўляюцца.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ


1. Паўстанне 1863–1864 гг. у Польшчы, Беларусі, Літве і Украіне: гісторыя і памяць : зб. навук. арт. / уклад.: В. В. Яноўская, А. У. Унучак, А. Э. Фірыновіч ; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2014. – 427 с.
2. Паўстанне 1863–1864 гг. і лёсы Беларусі : зб. арт. / гал. рэд. В. Булгакаў. – Мінск : Рэд. часопіса «Архэ-Пачатак», 2010. – 316 с.
3. Кастусь Каліноўскі і яго эпоха ў дакументах і культурнай традыцыі. – Мінск : Беларус. гіст. т-ва, 2011. – 220 с.
4. Кастусь Каліноўскі і нацыятворчы працэс у Беларусі : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Лондан, 27–29 сак. 2014 г. / пад рэд. А. Смаленчука і Д. Дынглі. – Мінск : Зміцер Колас, 2015. – 180 с.
5. Матвейчык, Д. Ч. Паўстанне 1863–1864 гадоў у Беларусі : нарыс баявых дзеянняў / Д. Ч. Матвейчык. – Мінск : Медысонт, 2013. – 122 с.
6. Матвейчык, Д. Ч. Удзельнікі паўстання 1863–1864 гадоў : біягр. слоўн. (паводле матэрыялаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі) / Д. Ч. Матвейчык. – Мінск : Беларусь, 2016. – 735 с.
7. Мураўёў, М. Нататкі пра кіраванне Паўночна-Заходнім краем і пра падаўленне ў ім бунту / М. Мураўёў. – Мінск : Лімарыус, 2016. – 224 с.
8. Янушкевіч, Я. «Тварам да шыбеніцы». Кастусь Каліноўскі і паўстанне 1863–1864 гадоў у беларускай і летувіскай паэзіі : анталогія / Я. Янушкевіч. – Ракаў, 2013. – 182 с.
9. Сведения о польском мятеже 1863 года в Северо-Западной России / собрал В. Ратч. – Вильно, 1867. – Т. 1. – 675 с.
10. Ігнатоўскі, У. 1863 год на Беларусі : нарыс падзей / У. Ігнатоўскі. – Мінск, 1930. – 276 с.
11. Смірноў, А. П. Кастусь Каліноўскі ў паўстанні 1863 года / А. П. Смірноў. – Мінск : Дзяржвыд БССР, 1959. – 192 с.
12. Смирнов, А. Ф. Восстание 1863 г. в Литве и Белоруссии / А. Ф. Смирнов. – М. : АН СССР, 1963. – 392 с.
13. Смирнов, А. Ф. Кастусь Калиновский / А. Ф. Смирнов. – Минск : Госиздат БССР, 1963. – 200 с.
14. Шалькевич, В. Ф. Кастусь Калиновский. Страницы биографии / В. Ф. Шалькевич. – Минск : Университетское, 1988. – 239 с.
15. Лясковский, А. И. Литва и Белоруссия в восстании 1863 г. (по новым архивным материалам) / А. И. Лясковский. – Берлин : Архамасъ, 1939. – 191 с.
16. Fajnhauz, D. 1863: Litwa i Białoruś / D. Fajnhauz. – Warszawa : Neriton, 1999. – 357 s.
17. Laniec, S. Litwa i Białoruś w dobie konspiracji i powstania zbrojnego (1861–1864) / S. Laniec. – Olsztyn : Ośrodek Badań Naukowych im. W. Ketrzyńskiego, 2002. – 196 s.
18. Laniec, S. Powstanie styczniowe na Litwie / S. Laniec. – Olsztyn : Instytut Historii Uniwersytetu Warmińsko-Mazurskiego, 2000. – 172 s.
19. Біч, М. Паўстанне 1863–1864 гг. у Беларусі / М. Біч // Гісторыя Беларусі : у 6 т. / М. Біч [і інш.] ; рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2000–2005. – Т. 4 : Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.). – 2005. – 519 с.

20. Каліноўскі, К. За нашу вольнасць : творы, дакументы / К. Каліноўскі ; уклад, прадм., паслясл., камент. Г. Кісялёва. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 1999. – 464 с.

21. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. : у 2 кн. / А. А. Каваленя [і інш.] ; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – Кн. 1. – 584 с.

22. На шляху станаўлення беларускай нацыі: гістарыяграфічныя здабыткі і праблемы / В. В. Яноўская [і інш.] ; навук. рэд. В. В. Яноўская ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – 311 с.

23. Калиновский, К. Из печатного и рукописного наследия / К. Калиновский. – Минск : Беларусь, 1988. – 208 с.

24. По показанию студента Гажича и других насчет учрежденных между студентами обществ из Русских, Немцев, Поляков и Малороссиян. 1863 г. // Государственный архив Российской Федерации. – Ф. 109. I экспедиция. 1863 г. Спр. 23. Ч. 313.

25. Дело Временного полевого аудиториата Виленского военного округа о помещике графе Викторе Старжинском. 27 июня – … ноября 1863 г. // Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы (ДГАЛ). – Ф. 1248. Оп. 1. Д. 1.

26. О помещике Виленской губернии, Вилейского уезда, отставном поручике Александре Оскерко, осужденном за сношение с мятежниками. 20 февраля – … марта 1864 г. // ДГАЛ. – Ф. 1248. Оп. 2. Д. 226. Т. I.

27. Следча-судовая справа Кастуся Каліноўскага / уклад. З. Кузменка. – Мінск : Галіяфы, 2014. – 142 с.

28. Восстание в Литве и Белоруссии 1863–1864 гг. Материалы и документы / гл. ред.: С. Кеневич [и др.]. – М. : Наука, 1965. – 588 с.

29. Революционный подъем в Литве и Белоруссии в 1861–1862 гг. Документы и материалы. – М. : Наука, 1964. – LXXII с. ; 708 с.

30. Материалы польского восстания 1863 г. // Российский государственный военно-исторический архив. – Ф. 484. Оп. 2. Д. 659.

31. Показания и записки о польском восстании 1863 года Оскара Авейдэ. – М. : Изд-во АН СССР, 1961. – 663 с.

32. Русско-польские революционные связи. – М. : Изд-во АН СССР, 1963. – Т. I. – CXXII с. ; 583 с.

33. Лушчыцкі, І. Н. Нарысы па гісторыі грамадска-палітычнай і філасофскай думкі ў Беларусі ў другой палавіне XIX в. / І. Н. Лушчыцкі. – Мінск : Выд-ва БДУ імя В. І. Леніна, 1958. – 367 с.

34. Каўка, А. Беларускі вызваленчы рух / А. Каўка // Спадчына. – 1991. – № 5. – С. 5–10.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 27.04.2017

***Marozau S.P.* «Lithuanian Separatist» Kanstantsin Kalinouski**

*The question of the statehood of Belarusian-Lithuanian lands acquired in 1861–1864 new public response: with whom to be – with Russia, Poland or with «no one». The slogan of the struggle for state independence of Lithuania and Belarus on the basis of historical tradition of Grand Duchy of Lithuania and the requirement of free national and cultural development of it peoples, put by K. Kalinovsky in the revolt of 1863, provided the basis for many of his contemporaries to interpret his political position as separatism. The leaders of the Warsaw Central National Committee Ya. Geyshtar, O. Aveyde, Yu. Yanovsky accused him in the separatism regarding Poland. The first historians of the uprising and its participants V. Pshybarovski B. and B. Limanowski wrote about federalist and separatist tendencies of K. Kalinouski. The official historian of the revolt V.F. Ratch strongly emphasized his separatist credo. Journalistic heritage of K. Kalinowski shows that he acted as a defender of the interests of historical Lithuania and its peoples. Researchers of the revolt (V. Ignatovskiy, A.P. Smirnov, G. Kiselev etc.) recognized the presence in his program of the requirement of independent Lithuanian-Belarusian state.*